*М. М. МЯЗГА*

# У. І. ПІЧЭТА ЯК ДАСЛЕДЧЫК ПОЛЬСКА-САВЕЦКІХ АДНОСІН МІЖВАЕННАГА ЧАСУ

Шырока вядомы вялікі ўклад, які ўнёс у арганізацыю гістарычнай навукі ў Беларусі і правядзенне гістарычных даследаванняў У. І. Пічэта. Яго навуковая і арганізатарская дзейнасць выклікала значную даследніцкую цікавасць з боку гісторыкаў. У гэтай сувязі прыгадаем работы Э. Р. Іофе, А. А. Яноўскага, А. В. Баранавай. Іх аўтары большы акцэнт робяць на вывучэнні ролі У. І. Пічэты як арганізатара навукі і адукацыі ў БССР і менш даследуюць яго дзейнасць з пункту гледжання ўкладу ў развіццё гістарыяграфіі. Неабходна заўважыць, што навуковыя інтарэсы А. І. Пічэты ў асноўным канцэнтраваліся на дасавецкім перыядзе. Адпаведна, на гэты пласт яго навуковай спадчыны і звярталі асноўную ўвагу даследчыкі. Таму работы У. І. Пічэты, якія прысвечаны гісторыі польска-савецкіх адносін, не сталі прадметам глыбокага гістарыяграфічнага даследавання. Гэтую задачу мы паспрабуем часткова вырашыць у дадзеным артыкуле.

Звяртаючыся да праблемы польска-савецкіх адносін у міжваенны час, У. І. Пічэта асноўную ўвагу акцэнтаваў на двух перыядах: польска-савецкая вайна і Рыжскі мір і далучэнне Заходняй Беларусі да БССР. Найбольш фундаментальным даследаваннем па праблематыцы міжнародных адносін з’яўляецца работа У. І. Пічэты «Польска-савецкія адносіны і Рыжскі мір», якая была надрукавана ў некалькіх нумарах часопіса «Полымя» ў 1928 г. Даследаванне пазначанай у артыкуле праблемы аўтар пачынае з агульнай характарыстыкі польскай палітыкі царскай Расіі ў час Першай сусветнай вайны. Ён разглядае розныя праекты прадастаўлення Польшчы самакіравання, якія распрацоўваліся прадстаўнікамі расійскага ўрада ў час Першай сусветнай вайны. У. І. Пічэта робіць адназначную выснову, што, нягледзячы на асобныя адрозненні праектаў, расійскі ўрад выступаў супраць рэальнага самакіравання Польшчы. Польскі край павінен быў застацца падпарадкаваным расійскай культуры, расійскаму ўплыву [1, с. 148—149]. З далейшага зместу артыкула

**Мязга Мікалай Мікалаевіч** — дэкан гістарычнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

можна зрабіць выснову, што аналіз палітыкі царскай Расіі патрэбен быў для таго, каб на яе фоне ў максімальна прывабным святле прадставіць палітыку Савецкай Расіі ў дачыненні да Польшчы.

У другім раздзеле артыкула пачынаецца даследаванне польска-савецкіх адносін з моманту іх зараджэння. Перш за ўсё У. І. Пічэта ўказвае на тое, што савецкая ўлада цалкам прызнала незалежнасць Польшчы, хаця гэтая незалежнасць «была абмежавана рамкамі буржуазнай дзяржавы». Цікава, што У. І. Пічэта ўказвае на тое, што «Версальскі мір утварыў новую самастойную Польшчу» і нічога не піша пра ролю Кастрычніцкай рэвалюцыі ў аднаўленні Польскай дзяржавы [1, с. 160]. Наступны тэзіс, які адстойвае даследчык, заключаецца ў рэзкім супрацьпастаўленні палітыкі Савецкай Расіі і Польшчы ў рамках двухбаковых адносін. Ён адзначае: «Савецкі ўрад выявіў у адносінах да Польшчы палітыку найвялікшай ціхамірнасці і ў выпадку ўзнікнення канфліктаў стараўся вырашыць гэтыя канфлікты мірным спосабам». У той жа час польскія ўрады з моманту аднаўлення незалежнасці Польшчы не маглі «згадзіцца з існаваннем Савецкай Рэспублікі» [1, с. 160]. У якасці першага канфлікту ў польска-савецкіх адносінах У. І. Пічэта разглядае сітуацыю, якая склалася вакол прадстаўніцтва польскай Рэгенцкай Рады ў Маскве. Віна за яго цалкам ускладаецца аўтарам на польскі бок. Толькі «дзякуючы ціхамірнай палітыцы Савецкай Расіі першы інцыдэнт паміж Польшчай і Савецкай Рэспублікай быў ліквідаваны» [1, с. 161—162]. Аднак у тэлеграме наркама замежных спраў РСФСР Г. Чычэрына міністру замежных спраў Польшчы Л. Васілеўскаму фактычна прызнаецца, што савецкі ўрад нічога не зрабіў для абароны правоў польскай дыпламатычнай місіі ў Расіі. Праўда, віна за яе разгром ускладаецца на польскіх бежанцаў у Расіі, якія больш не прызнавалі ўлады Рэгенцкага Савета ў Польшчы [2, с. 21].

Урэгуляванне канфлікту вакол польскага прадстаўніцтва ў Расіі не прывяло да нармалізацыі польска-савецкіх адносін. На думку У. І. Пічэты, польскі ўрад адмовіўся ад усталявання дыпламатычных адносін і ўжо на мяжы 1918—1919 гг. стаў пагражаць вайной, «спасылаючыся на савецкі імперыялізм» [1, с. 162—163]. Сапраўды, у канцы 1918 — пачатку 1919 г. выразна абазначыліся контуры польска-савецкага супрацьстаяння. На наш погляд, дзеянні абодвух бакоў у тыя дні вялі справу да ўзброенага сутыкнення. З аднаго боку, гэта імкненне Савецкай Расіі распаўсюдзіць бальшавізм на тэрыторыю Беларусі і Літвы, што ўспрымалася польскімі правячымі коламі як прамая пагроза для сваёй краіны. Л. Васілеўскі ў пасланні Г. Чычэрыну ад 30 снежня 1918 г. адзначае, што

савецкія войскі занялі тэрыторыю Літвы і Беларусі. Наяўнасць у складзе Чырвонай Арміі палкоў, сфарміраваных з польскіх салдат, разглядалася ўрадам Польшчы як імкненне перанесці на яе тэрыторыю сацыялістычную рэвалюцыю [2, с. 30—31]. З другога боку, Польшча імкнулася тым ці іншым спосабам уключыць тэрыторыі Беларусі, Літвы, Украіны ў сферу свайго ўплыву. Г. Чычэрын указваў Л. Васілеўскаму ў тэлеграме ад 7 студзеня 1919 г., што Польшча не мае ніякіх правоў на тэрыторыю Літвы і Беларусі [2, с. 34]. Сутыкненне гэтых памкненняў і рабіла польска-савецкі канфлікт непазбежным.

У першыя два-тры месяцы 1919 г. У. І. Пічэта адзначае некаторае пацяпленне ў польска-савецкіх адносінах. У прыватнасці, быў урэгуляваны канфлікт у сувязі з расстрэлам на польскай тэрыторыі місіі расійскага Чырвонага Крыжа. Тым не менш, на думку даследчыка, ніякай агульнай згоды быць не магло. Пры гэтым ён адзначае, што савецкі ўрад гатоў быў пайсці на ўрэгуляванне шэрагу спрэчных пытанняў з Польшчай. Ён выказваў гатоўнасць вырашыць пытанне аб усходняй граніцы Польшчы. Але, захапіўшы Вільню, польскі ўрад зрабіў немагчымым мірнае ўрэгуляванне канфлікту ў той момант. Мэтай польскіх правячых колаў У. І. Пічэта абвяшчае знішчэнне «Савецкіх Рэспублік у Літве і Беларусі». Сутнасць палітыкі Польшчы ў дачыненні да гэтых рэспублік ён тлумачыць, па-першае, класавымі інтарэсамі («вярнуць панскія маёнткі»), па-другое, жаданнем «адпіхнуць ад межаў Польшчы РСФСР, існаванне якой, зразумела, было непрыемна для польскай буржуазіі» [1, 164—165, 166]. Нам прадстаўляецца, што ў лютым — сакавіку 1919 г. савецкі ўрад у сувязі з цяжкім становішчам на ўсходнім фронце гатоў быў пайсці на кампраміс с Польшчай. У тэлеграме Г. Чычэрына новаму міністру замежных спраў Польшчы І. Падэрэўскаму ад 10 лютага адзначалася жаданне савецкага ўрада прыняць польскага прадстаўніка для абмеркавання тэрытарыяльнага пытання [3, с. 40]. У той жа час аўтар не звяртае ўвагі на тое, што такія палажэнні савецкіх прапаноў, як вызначэнне статусу беларускіх і ўкраінскіх зямель праз «галасаванне працоўных», гэта значыць толькі часткі іх насельніцтва, не магло быць прынята польскім бокам.

У трэцім раздзеле свайго артыкула У. І. Пічэта дэталёва аналізуе прычыны ўзнікнення польска-савецкай вайны і ролю ў гэтых падзеях Літоўска-Беларускай ССР. Ён адзначае імкненне ўрада ЛітБел да міру і яго прапанову Польшчы мірнымі сродкамі вырашыць тэрытарыяльнае пытанне. Аднак польскі ўрад усе мірныя прапановы адхіліў. Палітыку Польшчы У. І. Пічэта ў першую чаргу тлумачыць класавымі інтарэсамі

яе правячых колаў. Яны імкнулісяаднавіць прыватную ўласнасць на беларускіх, украінскіх і літоўскіх землях, перш за ўсё зямельную ўласнасць памешчыкаў. Польская буржуазія хацела захапіць землі на ўсходзе як рынкі збыту для сваёй прадукцыі [4, с. 84—85]. На наш погляд, даследчык перабольшвае класавы аспект, калі разглядае прычыны вайны Польшчы супраць савецкіх рэспублік. На першым плане для Ю. Пілсудскага і іншых кіраўнікоў Польшчы ў той момант была задача адцясніць Расію максімальна далёка на ўсход. Пры гэтым яны не імкнуліся да ліквідацыі савецкага ўрада, не хацелі садзейнічаць перамозе «белага» руху, у якім пераважалі сілы, выступаўшыя за адзіную і непадзельную Расію. Сведчаннем такой пазіцыі Пілсудскага з’яўляюцца яго паводзіны восенню 1919 г., калі ён прыпыніў наступленне польскай арміі ў час рашаючых баёў Чырвонай Арміі з войскамі Дзянікіна.

У. І. Пічэта выдзяляе дзве лініі ў польскай усходняй палітыцы. Пілсудскі, на яго думку, адзначаў магчымасць «арганізацыі самакіравання для Літвы, дзякуючы чаму захопленая тэрыторыя павінна была ўвайсці ў склад польскай рэспублікі на падставах вуніі». З другога боку, ён вылучае «прыхільнікаў аднаўлення Польшчы да межаў 1772 г. Гэтыя асобы былі прыхільнікамі і адзінай Польшчы...» [4, с. 85]. Сучасныя даследаванні даюць падставы сцвярджаць, што сярод прыхільнікаў унітарнай польскай дзяржавы (перш за ўсё — эндэкаў) не было аўтарытэтных дзеячаў, якія імкнуліся б да граніц 1772 г. Гаворка ішла аб уключэнні ў склад Польшчы такіх тэрыторый на ўсходзе, з такой колькасцю няпольскага насельніцтва, каб не ствараць пагрозы яе аслаблення праз нацыянальныя рухі і каб было магчымым з часам асіміляваць няпольскае насельніцтва. Распрацаваная адным з лідараў польскай «правіцы» Р. Дмоўскім лінія польскай усходняй граніцы праходзіла значна заходней ад мяжы 1772 г.

Далей У. І. Пічэта звяртае ўвагу на тое, як польскія правячыя колы планавалі вырашэнне беларускага пытання. Ён адзначае, што ўрад Пілсудскага «ніводнай хвіліны не думаў, каб даць Беларусі такія самыя правы, якія мае і Польшча, і каб гэтае аб’яднанне не толькі на словах, але і на справе было роўнага з роўным» [4, с. 86]. Безумоўна, трэба пагадзіцца з аўтарам, што польскія правячыя колы ніколі не разглядалі патэнцыяльна незалежную Беларусь як раўнапраўнага партнёра Польшчы.

Нягледзячы на агрэсіўныя дзеянні Польшчы ў 1919 г., савецкі ўрад, на думку А. І. Пічэты, працягваў шукаць шляхі да мірнага ўрэгулявання канфлікту. Доказам мірнай палітыкі РСФСР была, у прыватнасці, нота савецкага ўрада ад 22 снежня 1919 г. У. І. Пічэта лічыць, што прапанова

савецкага ўрада аб пачатку мірных перамоў была толькі фармальна прынята польскім бокам. Адмовіўшыся заключыць перамір'е на ўсім фронце і настойваючы на Барысаве, як на месцы перамоў, польскі ўрад іх фактычна зрываў. Падсумоўваючы, аўтар піша: «Адмаўленне Польшчы ад мірных перамоў азначала заклік да вайны. Усе спробы савецкага ўрада вырашыць мірным спосабам тэрытарыяльныя ды іншыя спрэчныя пытанні скончыліся няўдачай» [4, с. 87—88]. Сапраўды, у канцы 1919 — пачатку 1920 г. савецкі ўрад неаднаразова прапаноўваў Польшчы пачаць мірныя перамовы і выказваў гатоўнасць пайсці на вялікія тэрытарыяльныя саступкі. Сведчаннем імкнення савецкага кіраўніцтва да замірэння з Польшчай у той момант з'яўляецца шэраг дыпламатычных дакументаў. У прыватнасці, можна адзначыць запіску Г. Чычэрына ў сакратарыят ЦК РКП (б) ад 14 лютага 1920 г. Ён адзначае, што палітыка савецкага ўрада ў дачыненні да Польшчы ў тыя дні заключалася «ў паслядоўным прымірэнні і ў тым, каб пазбегнуць з нашага боку ўсялякага наступлення» [5, с. 46]. Але Пілсудскі ў той момант яшчэ не развітаўся з федэралісцкай ідэяй, і паход на Кіеў павінен быў стаць спробай яе рэалізаваць. Так што ініцыятыва аднаўлення ваенных дзеянняў сапраўды зыходзіла з польскага боку.

У. І. Пічэта абгрунтоўвае пункт гледжання, што нават пасля пачатку паходу Пілсудскага на Украіну савецкі ўрад працягваў імкнуцца да мірнага ўрэгулявання канфлікту. Пры гэтым «у інтарэсах міру быў гатоў саступіць Польшчы значныя тэрыторыі, нават не заселеныя ў большасці палякамі» [4, с. 89—90]. У. І. Пічэта лічыць, што Савецкая Расія не мела ніякіх агрэсіўных намераў у адносінах да Польшчы і ў час паходу на Варшаву. У прыватнасці, не ставілася задача «насадзіць камунізм пры дапамозе расійскіх штыкоў» у Польшчы. Але далей У. І. Пічэта прызнае, што Чырвоная Армія на занятай тэрыторыі Польшчы «імкнулася ўтварыць новы і разбурыць буржуазны лад <...> стараючыся перадаць рабочым вырваную з рук буржуазіі ўладу» [6, с. 126]. Абапіраючыся на даступныя крыніцы, мы можам зрабіць выснову аб эвалюцыі пазіцыі савецкага кіраўніцтва адносна падштурхоўвання сацыялістычнай рэвалюцыі ў Польшчы. Чычэрын у красавіку 1920 г. выказаў меркаванне, што ўступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыю Польшчы «атруціць нават значную частку рабочага класа абаронніцтвам». З гэтым пагадзіліся ў той момант Ленін і Троцкі [7, с. 4]. Але па меры разгортвання паспяховага наступлення Чырвонай Арміі ідэя прынесці на яе штыках рэвалюцыю ў Польшчу авалодала савецкім кіраўніцтвам. У тэзісах Пленума ЦК РКП (б) у сувязі з нотай Керазана ад 16 ліпеня 1920 г. адзначалася: «Да-

памагчы пралетарыяту і працоўным масам Польшчы вызваліцца ад іх памешчыкаў і капіталістаў» [8, с. 142].

Цэнтральнае месца ў сваім даследаванні У. І. Пічэта адводзіць вывучэнню ходу савецка-польскіх мірных перамоў у Мінску і Рызе ў 1920 г. Ён адзначае, што «заходняя буржуазія» аказала ціск на польскі ўрад, каб той пачаў мірныя перамовы, бо баялася поўнага разгрому Польшчы [4, с. 90]. У. І. Пічэта вельмі дэталёва, па пасяджэннях рэканструюе ход перамоў. Ім выказваюцца абвінавачванні ў адрас польскай дэлегацыі ў зацягванні перамоў, а прычына гэтага бачыцца аўтару ў поспехах польскай арміі на фронце. Гэта ж, на думку У. І. Пічэты, паслужыла прычынай таго, што польская дэлегацыя адмовілася прыняць савецкія ўмовы міру. Тут палякам дапамагло яшчэ і наступленне Урангеля [4, с. 99—100].

У. І. Пічэта справядліва адзначае, што пазіцыю польскай дэлегацыі ў Рызе вызначалі палітыкі, якія належалі да лагера нацыянальнай дэмакратыі. Даследчык дастаткова аб’ектыўна ахарактарызаваў іх пазіцыю на рыжскіх перамовах. Так, польскія нацыянал-дэмакраты не выступалі за Польшчу ў граніцах 1772 г. Яны імкнуліся заключыць мір з Савецкай Расіяй на памяркоўных умовах, каб сканцэнтраваць намаганні на ўмацаванні граніцы з Германіяй, якую лічылі галоўным ворагам Польшчы. Але і нацыянал-дэмакраты хацелі правесці польскую ўсходнюю граніцу значна ўсходней «лініі Керзана» [6, с. 128]. Пераходзячы да характарыстыкі пазіцыі Савецкай Расіі на перамовах, У. І. Пічэта лічыць яе доказам міралюбства савецкага ўрада, яго жадання заключыць трывалы мір з Польскай Рэспублікай. Каб хутчэй дабіцца міру, савецкая дэлегацыя гатова была ісці на значныя саступкі [6, с. 133, 138]. У. І. Пічэта вылучае два спрэчныя пытанні, па якіх у час перамоў ішлі найбольш вострыя дыскусіі: граніца і польскія прэтэнзіі на частку залатога фонда былой Расійскай імперыі [6, с. 140, 142]. Сапраўды, Г. Чычэрын у тэлеграме А. Іофе ў Рыгу 2 кастрычніка 1920 г. указвае на гэтыя два пункты як на найбольш істотныя пры падрыхтоўцы мірнага дагавора [9, с. 81]. Пры ацэнцы значэння Рыжскага міру У. І. Пічэта падкрэслівае, што ён спыніў польска-савецкую вайну і дазволіў Савецкай Расіі сканцэнтраваць усе сілы на барацьбе з Урангелем. Рыжскі мір, лічыць даследчык, мог стаць падставай для развіцця мірных адносін паміж Польшчай і РСФСР. Не адбылося гэта з-за адсутнасці добрай волі з боку польскага ўрада [6, с. 146—147].

Далучэнне да СССР Заходняй Беларусі актуалізавала даследаванне польска-савецкіх адносін у пачатку 1940-х гг. У 1940 г. выйшла з друку работа У. І. Пічэты «Асноўныя моманты гістарычнага развіцця Заход-

няй Украіны і Заходняй Беларусі». У гэтым даследаванні аўтар першапачаткова звяртаецца да агрэсіўных планаў Польшчы ў 1919—1920 гг. Па яго словах, яна імкнулася захапіць правабярэжную частку Савецкай Украіны, Савецкую Беларусь, каб «аднавіць у гэтых раёнах уладу польскіх паноў, пашырыць межы польскай дзяржавы ад мора да мора». У якасці адной з мэт польскай агрэсіі абазначана і імкненне «дапамагчы Урангелю разбіць Чырвоную Армію і аднавіць у Расіі ўладу памешчыкаў і капіталістаў» [10,с. 120]. Затым У. І. Пічэта звяртаецца да палітыкі Польшчы на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў 1921—1939 гг. Польскі бок абвінавачваецца ў невыкананні абавязацельства прадаставіць беларусам і ўкраінцам у Польшчы магчымасці для нацыянальнага і культурнага развіцця. На думку даследчыка, цэнтральным элементам польскай палітыкі на гэтых тэрыторыях была паланізацыя, вынікам польскага панавання стала абстаноўка «гаспадарчай разрухі, голаду, прыгнечання мас і ўсеагульнага незадавальнення». Затым робіцца вывад, што ва ўмовах нацыянальнага і сацыяльнага прыгнечання народныя масы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі чакалі дапамогі ад СССР [10, с. 120, 126]. Галоўная задача даследавання зводзіцца да абгрунтавання апраўданасці і неабходнасці ўключэння Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў склад СССР.

Яшчэ адна значная работа У. І. Пічэты, у якой закраналася праблема польска-савецкіх адносін, «Уз’яднанне польскіх зямель у польскай дзяржаве» з’явілася ў 1945 г. Звяртаючыся да праблемы фарміравання граніц Польшчы пасля Першай сусветнай вайны, аўтар адзначае намаганні Пілсудскага па захопе літоўскіх, беларускіх і ўкраінскіх зямель. Па яго меркаванні, гэта звязана з тым, што тут польскія магнаты мелі буйныя маёнткі. У той жа час правячыя колы Польшчы не прыклалі належных намаганняў, каб далучыць да Польшчы землі на захадзе [11, с. 17].

Работы У. І. Пічэты, прысвечаныя гісторыі польска-савецкіх адносін у 1918—1939 гг., неслі на сабе адбітак моцнага ідэалагічнага і палітычнага ўплыву. Яны выконвалі задачу прадставіць у найлепшым святле савецкую палітыку ў дачыненні да Польшчы. Гэта перашкодзіла аб’ектыўна ацаніць шэраг момантаў польска-савецкіх адносін міжваеннага часу. Паколькі ў аснову даследаванняў міжнародных адносін У. І. Пічэта паклаў класавы падыход, яму было цяжка выявіць і ацаніць увесь комплекс фактараў, якія ўплывалі на гэтыя адносіны. Аднак яго даследаванні, прысвечаныя польска-савецкім мірным перамовам, утрымліваюць багаты фактычны матэрыял і дазваляюць дэталёва прасачыць ход перамоў.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Пічэта, У.* Польска-савецкія адносіны і Рыскі мір / У. Пічэта // Полымя. 1928. № 4. С. 146—166.
2. Народный Комиссар Иностранных Дел РСФСР Г. Чичерин — Министру Иностранных Дел Польской Республики Л. Василевскому. 27/12, 1918 // «Красная книга». Сборник дипломатических документов о русско-польских отношениях 1918—1920 гг. М. : Гос. изд-во, 1920. 112 с.
3. Народный Комиссар Иностранных Дел РСФСР Г. Чичерин — Министру Иностранных Дел Польской Республики И. Падеревскому. 10/02, 1919 // «Красная книга». Сборник дипломатических документов о русско-польских отношениях 1918—1920 гг. М. : Гос. изд-во, 1920. 112 с.
4. *Пічэта, У.* Польска-савецкія адносіны і Рыскі мір / У. Пічэта // Полымя. 1928. № 5. С. 83—100.
5. Записка Г. В. Чичерина о политике РСФСР в отношении Восточной Галиции в Секретариат ЦК РКП. Копия тов. Ленину. 14 февраля 1920 г. // Польско-советская война 1919—1920. (Ранее не опубликованные материалы): в 2 ч. Ч. 1. М. : Ин-т славяноведения и балканистики РАН, 1994.
6. *Пічэта, У.* Польска-савецкія адносіны і Рыскі мір / У. Пічэта // Полымя. 1928. № 6. С. 126—147.
7. Архив внешней политики Российской Федерации. Ф. 04. Оп. 32. П. 204. Д. 22.
8. Тезисы Пленума ЦК РКП (б) в связи с нотой Д. Н. Керзона. 16 июля 1920 г. // Польско-советская война 1919—1920. (Ранее не опубликованные материалы): в 2 ч. Ч. 1. М. : Ин-т славяноведения и балканистики РАН, 1994.
9. Депеша Г. В. Чичерина относительно условий прелиминарного договора А. Иоффе 2 октября 1920 г. // Польско-советская война 1919—1920. (Ранее не опубликованные материалы): в 2 ч. Ч. 2. М. : Ин-т славяноведения и балканистики РАН, 1994.
10. *Пичета, В.* Основные моменты исторического развития Западной Украины и Западной Беларуси / В. Пичета. М. : Гос. соц.-экон. изд-во, 1940. 136 с.
11. *Пичета, В. И.* Воссоединение польских земель в польском государстве. Стенограмма публичной лекции, прочитанной в лекционном зале в Москве / В. Пичета. М. : Правда, 1945. 24 с.


## РЭЗЮМЭ. SUMMARY


В статье проанализирован вклад В. И. Пичеты в изучение истории польско-советских отношений в 1918—1939 гг. Отмечены основные положения и выводы, к которым он пришел в ходе своих исследований по указанной проблематике. Выявлена степень их научной значимости в соответствии с состоянием современной историографии проблемы и материалами известных на данный момент исторических источников.

A.V. Pecheta's contribution to study the history of Polish-Soviet connections in 1918—1939 has been analyzed in the article; main regulations and summary that he made in the course of his researches in the given field have been noted. The degree of their scientific significance in accordance with the state of present-day historiography problem and materials of historical sources known at present have been displayed.


Артыкул паступіў у рэдакцыю 17 сакавіка 2011 г.